**Аляксандр Свораб**
**Беларускі дзяржаўны універсітэт**

# НЕКАТОРЫЯ АСПЕКТЫ МАЛАДЗЁЖНАГА СТЫЛЮ ДРУКАВАНЫХ СМІ

Адметнай рысай новага аблічча прэсы з’яўляецца ўсё большая яе візуалізацыя. Да яе вядзе нарастаючая канкурэнцыя з электроннымі сродкамі масавай інфармацыі, Інтэрнетам, якія прапаноўваюць у першую чаргу карцінку. Адсюль – “мазаічная” падача інфармацыі, драбленне тэкстаў на “кліпы”, выкарыстанне мноства колераў і адценняў.

Адбываецца далейшая дыферэнцыяцыя выданняў па характару чытацкай аўдыторыі, тыпу прапанаванай інфармацыі. Бо стыль – гэта выяўленне ўнутранага настрою, а парушэнне стылю – гэта парушэнне гармоніі паміж унутраным і знешнім. Такім чынам, у паняцці “стыль” важнае значэнне набывае сацыяльны аспект: чытацкая аўдыторыя, яе ўзроставыя асаблівасці, пэўныя схільнасці да ўспрыняцця той ці іншай інфармацыі.

У маладых людзей ёсць два галоўныя жаданні – быць адметнымі і зразумелымі. Таму афармленне маладзёжных выданняў павінна быць арыгінальным і абавязана размаўляць на “каляровай” мове сваёй аўдыторыі. Камунікатыўная і сімвалічная функцыя колеру ў маладзёжных газетах і часопісах праяўляецца слаба, а вось выразная функцыя значна мацнейшая.

Моладзь не любіць парадак (магчыма, таму што яго вельмі любяць дарослыя). Тут колер – не праваднік па старонках газеты і не памочнік у засваенні матэрыялаў. Кожны разварот можа быць аформлены ў сваім стылі з прымяненнем розных колераў, яркіх і насычаных: чым больш кантрастаў, тым лепш. Напрыклад, зялёны колер для шрыфта асноўнага тэксту, карычневы і чырвоны – для загалоўкаў, і ўсё гэта на жоўтым фоне.

Толькі маладую аўдыторыю магло б задаволіць такое спалучэнне, старэйшае пакаленне такі “ўзрыўны” разварот толькі напужаў бы. Часам вёрстку і каляровае афармленне выдання робяць такімі, каб затрымаць увагу на тэксце, і чытачу патрэбна спачатку некалькі хвілін разглядаць разварот, каб зразумець, дзе пачатак артыкула, дзе яго загаловак, дзе лід, а дзе подпісы да ілюстрацый.

Пазнавальная функцыя колеру ў маладзёжных выданнях неістотная. Тут не патрабуецца дакладнасць аб’екту і колеру. Маладому чытачу ўсё

роўна, ці будзе адпавядаць колер таму ці іншаму прадмету (хутчэй спадабаецца неадпаведнасць). Ён толькі пачынае набываць жыццёвы вопыт, і яму больш даспадобы эмоцыі, уражанні. Таму газета ці часопіс павінны быць аформлены эмацыянальна, а лепшы выразнік эмоцый – колер.

Як ужо адзначалася, моладзь адносіцца да той аўдыторыі, якая аддае перавагу яркім, насычаным фарбам.

“Ажывіць” маладзёжную газету можна і своеасаблівай кампазіцыяй – свабоднай, асіметрычнай кампаноўкай афармленчых элементаў. Большую свабоду кампазіцыйных варыянтаў забяспечвае прымяненне прынцыпаў нефармальнага балансу. Аднак ад афарміцеля, які імкнецца забяспечыць аптымальнасць успрыняцця, патрабуецца асаблівае майстэрства, бо новыя формы могуць прывесці да сцвярджэння новага шаблону.

Для стварэння дынамічных кампазіцый лепш за ўсё выкарыстаць элементы ломанай, гарызантальнай, вертыкальнай вёрсткі з той умовай, што яны не зменяць кардынальна графічную мадэль, а ўзбагацяць яе, не вельмі ўскладняючы выпуск выдання.

Эфектыўным сродкам дынамічнага архітэктурнага рашэння паласы, спосабаў кампаноўкі матэрыялаў з мэтай падкрэсліць іх сувязі і аптымізаваць сэнсавае ўспрыняцце візуальнай інфармацыі з’яўляюцца і прапорцыі.

Абапіраючыся на традыцыйныя, прыемныя воку суадносіны элементаў (21:34), афарміцелі не павінны пазбягаць іх змены. І сіметрыя (асіметрыя), і прапорцыя ствараюць у кампазіцыі газеты пэўны рытм, які служыць арганізацыі руху, і кіруюць позіркам чытача.

Для многіх маладзёжных газет характэрна плакатнасць першай старонкі, якая пераўтвараецца па сутнасці ў вокладку са шматлікімі анонсамі матэрыялаў унутраных старонак (асабліва ў газетах фарматаў А4, А3), і мазаічнасць структуры апошняй старонкі.

Прыкметнай стала ў маладзёжных газетах і роля ілюстравання. Візуальная інфармацыя ўсё больш настойліва пацясняе тэкставую. Газетныя тэксты становяцца карацейшымі, яны дапаўняюцца або замяняюцца фотаінфармацыяй; павышаецца роля візуальных элементаў, якім умелыя дызайнеры імкнуцца надаць канкрэтныя якасці.

Сёння мы з’яўляемся сведкамі шматлікіх стылістычных рашэнняў адной маладзёжнай тэмы. Імкненне да стылёвага адзінства – таксама адметнасць нашай афармленчай культуры.